# ВЯРТАННЕ

**У Полацкім дзяржуніверсітэце** па ініцыятыве пасольства Украіны ў Рэспубліцы Беларусь і Фонда імя Марыі Магдалены Радзівіл адбылася **прэзентацыя ўнікальнага артэфакта** – надгробнай пліты з магілы Яна Баршчэўскага.



Фота Кірыла СМАЛЯКОВА.

На пліце — надпіс на польскай мове: «Ян Баршчэўскі, любіў Бога, прыроду і людзей, пісьменнік натхнёны і чулы. Жыў годна 70 гадоў. Памёр 28 лютага 1851 года».

Асаблівую значнасць падзеі надало тое, што заснавальнік новай беларускай літаратуры Ян Баршчэўскі вучыўся ў Полацкім іезуіцкім калегіуме на літаратурным аддзяленні факультэта свабодных навук. Ужо ў гады вучобы выявіўся ягоны паэтычны талент, але самым значным творам стаў «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях», у аснову якога ляглі легенды, сабраныя падчас падарожжаў па Расонскім краі, у наваколлі возера Нешчарда.

Пра асобу і творчы шлях пісьменніка распавялі старшы навуковы супрацоўнік расонскага Музея баявой садружнасці С.І.Салаўёў, прадстаўнікі гуманітарнага факультэта ПДУ — загадчык кафедры славянскай філалогіі С.М.Лясовіч і загадчык кафедры гісторыі і турызму А.І.Корсак, таксама ў рэжыме відэасувязі да прысутных звярнуўся вучоны з Санкт-Пецярбурга Д.А.Вінаходаў.

Знаходка стала сапраўднай сенсацыяй. Дзякуючы ёй высветліўся дакладны год нараджэння пісьменніка, бо ў гістарычных і літаратуразнаўчых крыніцах указваліся розныя даты: 1790, 1794, 1796-ы...

Ян Баршчэўскі нарадзіўся ў вёсцы Мурагі Расонскага раёна (тады гэта быў Полацкі павет Віцебскай губерні). Некаторы час жыў і працаваў на малой радзіме, пазней — у Пецярбурзе, а каля 1850 года пераехаў у Чудноў, дзе і завяршыў свой жыццёвы шлях. Звесткі пра тое, дзе знаходзіцца магіла, былі страчаны.

Надгробную чыгунную пліту знайшлі на прыватным падворку ў горадзе Чуднове Жытомірскай вобласці Украіны на пачатку 2000-х. Яна амаль дзесяць гадоў прастаяла каля гаспадарчых пабудоў, пакуль домаўладальнік не вырашыў зацэментаваць двор, закрыўшы частку яго знаходкай. Але на той час іржа з пліты сцерлася і стаў бачны надпіс. Дачка гаспадароў знайшла звесткі пра чалавека, імя якога пазначана на пліце, і высветлілася, што яна з магілы пісьменніка.

Такім чынам, славуты выпускнік, хоць на непрацяглы час, вярнуўся на радзіму, у сцены сваёй alma mater, якая дала яму пуцёўку ў творчае жыццё.

**Алена КАЛЕНІК.**